# РАЗВІЦЦЁ ПРАФЕСІЙНА-ТЭХНІЧНАЙ, СЯРЭДНЯЙ СПЕЦЫЯЛЬНАЙ І ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ Ў БССР У 20-я ГАДЫ XX СТ.

Сістэма школьнай адукацыі, якая сфарміравалася да сярэдзіны 1920-х гадоў, не з'яўлялася закончаным цыклам. Сямігодка, якая ў той час з'яўлялася асноўным тыпам агульнаадукацыйнай школы, не магла забяспечыць падрыхтоўку, неабходную для працягу заняткаў у вышэйшай школе. Гэты недахоп з'яўляўся адной з цяжкасцей у яе камплектаванні. Разам з тым у Беларусі ў розныя гады існавалі рабфакі, агульнаадукацыйныя курсы, спецкласы, школы другой ступені і дзевяцігодкі, якія давалі сярэднюю адукацыю. Але ж колькасць іх была параўнальна невялікая. З сярэдніх школ ўсіх тыпаў толькі рабочыя факультэты мелі пэўную і ясную лінію развіцця. Сярэднія школы іншых тыпаў перажывалі стадыю станаўлення і рэарганізацыі ў тэхнікумы і школы-сямігодкі.

Рабочыя факультэты — гэта асаблівы тып сярэдняй агульнаадукацыйнай школы, прызначаны для рабочых і сялян. 17 верасня 1920 г. за подпісам У.І.Леніна быў выдадзены дэкрэт "Аб рабочых факультэтах", які вызначыў задачы, змест і метады работы гэтых новых навучальных устаноў. "Асноўнай задачай факультэтаў, — указвалася ў дэкрэце, — з'яўляецца шырокае ўцягненне пралетарскіх і сялянскіх мас у сцены вышэйшай школы" [1, с.11]. Рабфакі былі закліканы даць магчымасць рабочым і сялянам выкарыстаць на практыцы свае правы на вышэйшую адукацыю.

Паводле "Палажэння аб рабочых факультэтах", на рабфакі прымаліся рабочыя і сяляне не маладзей 18 гадоў, якія працавалі фізічна на вытворчасці не менш трох гадоў. Пра асобы, якія не мелі неабходнага стажу фізічнай працы, пытанне вырашалася ў асабістым парадку. Уступных экзаменаў не было. Прыём слухачоў і размеркаванне іх па групах праводзілася шляхам гутаркі. З 1926 г. былі ўведзены экзамены. Асноўная маса студэнтаў першых курсаў рабфакаў мела пачатковую адукацыю. Кіруючым органам рабфака ў галінах вучэбнай, адміністрацыйнай і гаспадарчай з'яўляліся савет, прэзідыум, вучэбнае бюро і прадметныя камісіі. Студэнты ўваходзілі ў склад гэтых органаў і прымалі актыўны ўдзел ў арганізацыйна-акадэмічнай дзейнасці факультэта.

На тэрыторыі Беларусі першы рабочы факультэт быў адкрыты пры Горы-Горацкім земляробчым інстытуце ў 1920 г. У чэрвені 1921 г. быў адкрыты рабфак пры Беларускім дзяржаўным універсітэце. У ліку першых рабфакаў, створаных у Беларусі, быў рабфак у Оршы.

У лютым 1923 г. адбылося аб'яднанне рабфака БДУ з вячэрнім рабочым факультэтам. Апошні стаў вячэрнім аддзяленнем рабфака БДУ. Першы выпуск яго ў 1922/23 навучальным годзе склаў 40 чалавек.

Другі з'езд рабфакаў прыняў шэраг новых увядзенняў: выдзяленне ўхілаў, канцэнтрычную сістэму пабудовы праграм, лабараторны метад выкладання, развіццё пазашкольнай работы [2, арк.247-248]. Вучэбныя планы, праграмы і метад выкладання на

Библиотека БГУИР

рабочых факультэтах выпрацоўваліся Наркамасветы з такім разлікам, каб пазнаёміць слухачоў з навуковымі метадамі даследавання, даць ім дастатковы запас ведаў для паспяховай работы ў адной з вышэйшых навучальных устаноў, якія рыхтуюць неабходных для рэспублікі спецыялістаў [1, с. 10-11].

Рабфакі адкрываліся пры вышэйшых навучальных установах і карысталіся іх аўдыторыямі, кабінетамі, лабараторыямі і іншымі вучэбна-дапаможнымі ўстановамі, а таксама падручнікамі, інструментамі, матэрыяламі. З'яўляючыся арганічнай часткай ВНУ, на базе якіх яны былі створаны, рабфакі абслугоўваліся выкладчыцкім складам ВНУ [2, арк.388].

У першай палове 1920-х гадоў, калі эканамічнае становішча рэспублікі было асабліва цяжкае, фінансаванне рабфакаў ажыццяўлялася не толькі з рэспубліканскага бюджэту, але і з бюджэту Наркамасветы РСФСР. З Масквы рабфакі атрымлівалі значныя сродкі на рамонт памяшканняў, абсталяванне лабараторый і кабінетаў, стыпендыю студэнтам. Актыўны ўдзел ў пашырэнні матэрыяльнай базы факультэтаў прымалі самі рабфакаўцы. На адным з першых сходаў рабфакаўцы БДУ аднадушна вырашылі выдзяляць штомесячна частку стыпендыі на набыццё фізічных прылад. Рукамі студэнтаў і амаль поўнасцю на іх сродкі, заробленыя ў час летніх канікул, былі абсталяваны фізічны і прыродазнаўча-гістарычны кабінеты.

Рабочыя факультэты былі важным каналам, праз які вышэйшыя навучальныя ўстановы папаўняліся рабоча-сялянскай моладдзю. Так, у 1924 г. на тры існуючыя рабочыя факультэты (Мінскі, Аршанскі і Горацкі) было прынята 240 чалавек, з якіх рабочых, сялян і іх дзяцей было 215 [3, арк.288].

У 1927 г. у Беларусі працавала 6 рабфакаў (Мінскі, Аршанскі, Горацкі, Віцебскі, вячэрнія ў Мінску і Гомелі). Яны налічвалі 1 018 чалавек, з якіх рабочыя, сяляне і іх дзеці складалі 953 чалавекі [4, с.100]. У 1929 г. на 11 рабфаках Беларусі вучылася 95,2% рабочых і сялян ад ўсёй колькасці студэнтаў, у тым ліку 66% - рабочых [5, с.142].

Дзяржава праяўляла вялікі клопат пра стварэнне неабходных матэрыяльных умоў для вучобы рабочых і сялян. Працэнт забеспячэння стыпендыяй на рабфаках быў самы высокі. У 1925/26 навучальным годзе студэнты рабфакаў былі забяспечаны стыпендыяй на 99%, студэнты вышэйшых навучальных устаноў - на 45-60%, тэхнікумаў - на 43-50% [6, с.20], у 1929/30 навучальным годзе - на 100%, студэнты вышэйшых навучальных устаноў — на 50%, а навучэнцы тэхнікумаў - на 50-60% [7, арк.45].

Аднак існаваўшая ў Беларусі сетка рабфакаў не забяспечвала поўнага вырашэння пытання камплектавання вышэйшых навучальных устаноў. Напрыклад, у 1926 г. рабфакі Беларусі скончылі 239 чалавек, а ў ВНУ рэспублікі неабходна было прыняць 1 170 чалавек [8, с.154]. У 1929 г. урад рэспублікі прыняў меры па далейшаму развіццю рабфакаў і павышэнні іх значэння ў камплектаванні вышэйшых навучальных устаноў. Рабфакі былі разбуйнены, кожны з іх пачаў рыхтаваць сваіх слухачоў да паступлення ў тую ці іншую навучальную ўстанову, на базе якой ён быў арганізаваны. У сувязі з гэтым навучанне на рабфаку, застаючыся агульнадаступным, набыло некаторую прафесіянальную афарбоўку. Пастанова ЦК ВКП(б) ад 16 мая 1930 г. замацавала спецыялізацыю рабфакаў. Узніклі

Библиотека БГУИР

індустрыяльна-тэхнічныя, медыцынскія, сельскагаспадарчыя, педагагічныя рабочыя факультэты, прымацаваныя да адпаведных вышэйшых навучальных устаноў на правах самастойных аддзяленняў.

У студзені 1929 г. было распрацавана палажэнне "Аб завочным рабфаку". Завочны рабфак быў разлічаны на 5 гадоў, працаваў на падставе праграм і планаў рабфакаў БССР. Прыём на завочны рабфак праводзіўся па такіх жа правілах, як і на дзённы і вячэрні рабфакі, кіраўніцтва належала прэзідыуму мінскага дзённага рабфака. Студэнты завочнага рабфака, выканаўшы ўсю працу і здаўшы пераводныя і канчатковыя іспыты, залічваліся ў вышэйшыя навучальныя ўстановы на правах скончыўшых дзённыя і вячэрнія рабфакі [7, арк.140]. Рабочыя факультэты працавалі ў Магілёве, Мазыры, Оршы, Полацку, Віцебску, Гомелі, Барысаве, Бабруйску, Горках, Дуброўне, Жлобіне. Спецыяльна для сялянскай моладзі былі адкрыты рабфакі ў сяле Дукора і мястэчку Лёзна.

У далейшым колькасць рабочых факультэтаў значна павялічваецца. У 1930 г. у Беларусі працавала 25 вячэрніх і 8 дзённых рабфакаў. Рабочыя факультэты былі спецыфічнай сярэдняй школай Беларусі, якая давала магчымасць рабочай і сялянскай моладзі падрыхтавацца да навучання ў вышэйшых навучальных установах, выкарыстаць свае правы на атрыманне вышэйшай адукацыі. Стварэнне рабфакаў з'яўлялася лагічным працягам класавай палітыкі Савецкай дзяржавы.

Аднак сетка рабфакаў усё ж такі не забяспечвала камплектаванне вышэйшых навучальных устаноў неабходным кантынгентам. Патрэбнасць вышэйшай школы ў добра падрыхтаваных абітурыентах была вялікая, што прымушала органы народнай асветы шукаць дадатковыя шляхі падрыхтоўкі гэтага кантынгенту. Па рашэнні Наркамасветы Беларусі пры некаторых гарадскіх сямігадовых школах былі адкрыты двухгадовыя агульнаадукацыйныя курсы. Восенню 1922 г. такія курсы пачалі работу ў Мінску. Яны мелі два аддзяленні — гуманітарнае (для падрыхтоўкі на педагагічны факультэт і факультэт грамадскіх навук БДУ) і прыродазнаўча-матэматычнае (для паступаючых на медыцынскі факультэт і на фізіка-матэматычнае аддзяленне педфака БДУ, а таксама ў сельскагаспадарчы інстытут).

Вучэбныя планы аддзяленняў істотна адрозніваліся адзін ад аднаго. Новымі прадметамі ў вучэбных планах курсаў былі грамадазнаўства, канстытуцыя, палітычная эканомія, беларуская мова. Паводле палажэння аб двухгадовых агульнаадукацыйных курсах, зацверджанага Наркамасветы БССР у 1925 г., на курсах адкрылася трэцяе аддзяленне - фізіка-матэматычнае.

Агульнаадукацыйныя курсы былі платнымі. Гэта не дазваляла ім адыграць значнай ролі ў падрыхтоўцы кантынгенту для вышэйшых навучальных устаноў. Наплыў на курсы быў вялікі. Праўда, сярод паступаючых няшмат было дзяцей рабочых і сялян. Многія з тых, хто скончыў курсы, па свайму сацыяльнаму становішчу не адпавядалі патрабаванням, якія прад'яўляліся да паступаючых у вышэйшыя навучальныя ўстановы. У 1927/28 навучальным годзе ў гарадах Беларусі працавала 9 агульнаадукацыйных курсаў (у сельскай мясцовасці іх не было), на якіх займаліся 1 844 навучэнцы [9, с.1-3].

Библиотека БГУИР

Для падрыхтоўкі ў вышэйшыя навучальныя ўстановы Наркамасветы БССР практыкаваў адкрыццё кароткатэрміновых курсаў з працягласцю навучання 4—5 месяцаў. На 15 лістапада 1929 г. такія курсы працавалі ў Барысаве, Віцебску, Гомелі, Магілёве па 50 чалавек у кожным з гарадоў. Курсы па падрыхтоўцы для паступлення ў вышэйшыя навучальныя ўстановыг батракоў, калгаснікаў і сялян-беднякоў дзейнічалі ў Мінскай і Бабруйскай акругах — па 60 чалавек у кожнай, а таксама ў Віцебскай, Гомельскай, Магілёўскай, Полацкай, Аршанскай і Мазыгрскай акругах — па 30 чалавек у кожнай акрузе. Па лініі Цэнтральнага Савета прафесійных саюзаў Беларусі і грамадскіх арганізацый у Мінску, Гомелі і Барысаве былі арганізаваны курсы, на якіх навучаліся 483 чалавекі [10, арк.88]. Як правіла, курсы камплектаваліся з асоб, якія закончылі сямігодкі, прафтэхшколы, школы для дарослых.

Былі і іншыя спробы павялічыць колькасць моладзі з сярэдняй адукацыяй. З далучэннем Гомельшчыны на тэрыторыі Беларусі, зноў як і ў 1924 г., аказаліся дзве блізкія, але з некаторымі істотнымі адрозненнямі, школьныя сістэмы: існавалі школы II ступені і дзевяцігодкі, якіх у Беларусі да ўзбуйнення не было. Ва ўмовах неспрыяльнага становішча з падрыхтоўкай кантынгенту для камплектавання вышэйшых навучальных устаноў, Наркамасветы БССР не адважыўся пайсці на ліквідацыю школ II ступені і дзевяцігодак на Гомельшчыне, як гэта было зроблена на тэрыторыі Віцебскай і Магілёўскай губерняў у 1924 г. Больш таго, невялікая колькасць дзевяцігадовых школ была створана і ў іншых раёнах Беларусі. Цікава адзначыць размяшчэнне школ па акругах. 6 з 14 дзевяцігодак знаходзіліся ў Бабруйскай акрузе, 4 - у Мінскай, 2 — у Віцебскай, 1 — у Гомельскай, 1 — у Аршанскай. Школы II ступені знаходзіліся толькі на Гомельшчыне — іх было 8. Адкрываючы дзевяцігодкі, Наркамасветы БССР ў той жа час не адмаўляўся ад двухгадовых агульнаадукацыйных курсаў, якія сябе не апраўдвалі. Агульнаадукацыйныя курсы працавалі ў 6 акругах з 8 (акрамя Гомельскай і Полацкай). Амаль палова з іх (4 з 9) знаходзілася ў Мінскай акрузе [9, с.2-3]. Зразумела, што пры такой наяўнасці ўстаноў пытанне павелічэння колькасці моладзі з сярэдняй адукацыяй не магло быць вырашана.

Адначасова ў Беларусі была адкрыта невялікая колькасць прафесіянальных класаў пры сямігадовых працоўных школах. Яны з'яўляліся крокам у бок фактычнага збліжэння школьнай сістэмы БССР са школьнай сістэмай РСФСР, дзе ў гэты перыяд была ажыццёўлена прафесіяналізацыя старэйшых класаў дзевяцігодак і школ II ступені. У РСФСР VIII-IX класы прафесіяналізаваліся, у Беларусі VIII—IX класы ўводзіліся ў агульнаадукацыйныя сямігадовыя школы.

Калі ў Беларусі ў 1922 г. была прынята сістэма народнай асветы, у якой агульнаадукацыйнай школай стала сямігодка, мелася на ўвазе, што прамежкавай ступенню паміж ёй і вышэйшымі навучальнымі ўстановамі будуць тэхнікумы, прафесійныя школы, школы фабрычна-заводскага вучнёўства і спецыяльныя прафесійныя класы, якія адкрываліся пры сямігадовых працоўных школах. Гэтыя навучальныя ўстановы павінны былі даць вучням практычныя навыкі, неабходныя для паспяховай работы ў адпаведнай галіне вытворчасці, а таксама пэўныя агульнаадукацыйныя і спецыяльныя веды, якія

Библиотека БГУИР

дазволілі б свядома адносіцца да вытворчага працэсу. Апрача таго, вучні павінны былі атрымаць агульнаадукацыйную падрыхтоўку, неабходную для паступлення ў вышэйшыя навучальныя ўстановы. Дарога ў вышэйшыя навучальныя ўстановы павінна была праходзіць праз сярэднія прафесійныя ўстановы.

У верасні 1920 г. у складзе Наркамасветы ССРБ быў створаны аддзел прафесійна-тэхнічнай адукацыі. Спачатку ў яго апарат уваходзілі тры чалавекі — часова выконваючы абавязкі загадчыка, сакратар і інструктар. Хутка гэты аддзел быў пераўтвораны ў Камітэт прафесійна-тэхнічнай адукацыі, а затым у Галоўнае ўпраўленне прафесійна-тэхнічнай адукацыі, якое ўваходзіла ў склад Наркамасветы ССРБ. Задачай гэтага органа з'яўлялася падрыхтоўка кадраў для прамысловасці, сельскай гаспадаркі, устаноў асветы, аховы здароў"я і мастацтва.

У кастрычніку 1921 г. на V з'ездзе КП(б)Б у Мінску было вызначана, што асноўнай задачай прафесійна-тэхнічнай адукацыі з'яўляецца фарміраванне кадраў кваліфікаванымі рабочымі і тэхнікамі шляхам пашырэння ў першую чаргу сеткі ніжэйшых прафесійна-тэхнічных устаноў — прафтэхшкол, школ фабрычна-заводскага вучнёўства і прафтэхкурсаў [11, с.72]. Рост колькасці навучальных устаноў ніжэйшай прафесійна-тэхнічнай адукацыі ў ССРБ пачаўся з 1921 г. У Мінску ў гэтым годзе адкрыліся школы металістаў, дрэваапрацоўшчыкаў, паліграфістаў, абутковай і гарбарнай вытворчасці. Школы адкрываліся і ў іншых гарадах, галоўным чынам там, дзе захавалася база дзеючых да рэвалюцыі прафесійных школ: у Слуцку — металістаў, у Віцебску — металістаў, друкароў, гарбароў, у Магілёве — будаўнікоў, у Клімавічах — вучэбна-практычная майстэрня. У 1922 г. ствараецца шэраг новых прафесійна-тэхнічных школ: у Віцебску — дрэваапрацоўшчыкаў, тэктстыльшчыкаў пры фабрыцы "Дзвіна", у Магілёве, Чавусах, Горках — металістаў, у Бабруйскім павеце — школа пры шклозаводзе імя Камінтэрна, у Добрушы -школа пры папяровай фабрыцы і іншыя.

У Лужаснянскай сельскагаспадарчай школе класныя памяшканні знаходзіліся ў двухпавярховым каменным доме. З дарэвалюцыйнага часу ў некаторых вучэбных кабінетах захавалася абсталяванне: у кабінеце фізікі - больш за сто назваў навучальных дапаможнікаў, у геаграфічным - 61 карта. У школе былі таксама кабінеты хіміі і батанікі, чатыры вучэбныя класы, сталовая, кухня, два спальныя пакоі, бібіліятэка з 94 назвамі кніг. Гаспадарка мела 10 коней, 31 карову, па 20 павозак, саней, 106 дзесяцін зямлі [12, с.188].

Усяго да канца 1923 г. у рэспубліцы працавала больп за 40 стацыянарных прафесійна-тэхнічных навучальных устаноў, дзе налічвалася болын за 2 100 дзяцей і падлеткаў. Сярэдняя напоўненасць школ складала каля 50 чалавек.

У пачатку 1920-х гадоў недахоп сродкаў і матэрыяльных рэсурсаў, якія меліся ў распараджэнні Наркамасветы рэспублікі, патрабаваў упарадкавання сеткі навучальных устаноў, прыцягнення да іх утрымання гаспадарчых ведамстваў і мясцовых фінансавых органаў. У сувязі з гэтым у пачатку студзеня 1922 г. было прынята рашэнне прааналізаваць спіс дзеючых прафесійна-тэхнічных навучальных устаноў, вызначыць, якія з іх пакінуць на дзяржаўным бюджэце, а якія ўтрымліваць на бюджэце мясцовым, або перадаць на ўтрыманне адпаведных вытворчых упраўленняў. Пасля вывучэння гэтага пытання было

Бібліятэка БГУІР

вырашана захаваць фінансаванне з дзяржаўнага бюджэта наступных прафесійна-тэхнічных школ: Мінскую аб'яднаную прафтэхшколу, Мінскую школу-завод гарбарнай вытворчасці, Слуцкую школу металістаў, Бабруйскую і Барысаўскую сельскагаспадарчыя школы, вучэбную ферму ў Курасоўшчыне і Мінскія землямерныя курсы. Іншыя навучальныя ўстановы, якія рыхтавалі кваліфікаваных рабочых і рамеснікаў, былі перададзены на поўнае ўтрыманне гаспадарчых арганізацый. Сярод іх — Слуцкая і Барысаўская школы швейнай прамысловасці, Бабруйская і Мазырская школы дрэва- і металаапрацоўкі, Барысаўская школа металістаў і іншыя. Некаторыя курсы перадаваліся на ўтрыманне прафсаюзаў.

Каб захаваць адзіныя патрабаванні ў рабоце, усе прафесійна-тэхнічныя установы, у тым ліку і тыя, што былі зняты з дзяржаўнага забеспячэння, заставаліся пад кантролем Галоўнага ўпраўлення прафесійна-тэхнічнай адукацыі. Тут яны рэгістраваліся, зацвярджаліся статуты, вучэбныя планы і праграмы, формы пасведчанняў аб заканчэнні школы. Органам прафтэхадукацыі накіроўваліся справаздачы аб дзейнасці навучальных устаноў, ім было дадзена права праводзіць рэвізіі вучэбнай дзейнасці, патрабаваць запаўнення анкеты па ўстаноўленай форме, апытальных лісткоў [13, арк.382-386].

Трэба адзначыць, што ў рабоце прафтэхшкол меліся і сур'ёзныя недахопы. Далёка не ва ўсіх навучальных установах былі ўведзены пастаянныя вучэбныя планы і праграмы. Існаваў вядомы разрыў паміж тэарэтычным і вытворчым навучаннем. Прафтэхшколе не хапала вопытных, кваліфікаваных майстроў і педагогаў. Выклікала заклапочанасць слабае аснашчэнне ўстаноў вучэбна-вытворчым абсталяваннем, падручнікамі, нагляднымі дапаможнікамі. Не адпавядалі патрабаванням арганізацыя быту, матэрыяльнае абслугоўванне навучэнцаў. Напрыклад, у мінскіх прафтэхшколах адсутнічала нават электрычнае асвятленне. Абслугоўваў навучэнцаў усіх прафтэхшкол толькі адзін урач. У яго абавязкі ўваходзіла чытаць курс гігіены, праводзіць медыцынскі агляд дзяцей, наведваць майстэрні, сачыць за санітарна-гігіенічнымі ўмовамі ў школах і жылых памяшканнях.

Зразумела, зусім ліквідаваць недахопы не дазваляла тагачаснае гаспадарчае становішча рэспублікі, але ж палепшыць становішча прафтэхшкол было магчыма. Так, для паляпшэння харчавання, бытавых умоў, медыцынскага абслугоўвання ствараліся вучнёўскія камітэты, санітарныя і экалагічныя камісіі [14, с. 194-202]. У мэтах папярэдняй прапрацоўкі пытанняў вучэбна-метадычнага і праграмнага характару пры школьныгх саветах утвараліся камісіі: прадметныя, цыклавыя і вытворчыя [13, арк.387].

Нягледзячы на недахопы ў рабоце, сетка прафесійна-тэхнічных устаноў рэспублікі павялічвалася, асабліва ў гады сацыялістычнай індустрыялізацыі. У 1924/25 навучальным годзе сетка ўстаноў Галоўпрафадукацыі ўключала 21 прафтэхшколу, 11 школ фабрычна-заводскага вучнёўства [15, арк.102]. На 1 студзеня 1927 г. працавалі ўжо 30 прафтэхшкол, 15 школ фабрычна-заводскага вучнёўства, 18 прафесійных курсаў [16, с.67]. У наступныя гады сетка прафтэхустаноў яшчэ больш узрасла.

Паміж установамі прафадукацыі былі арганізаваны "пераклічкі" і "выклікі". Тая, ці іншая школа, уступіўшы ў сацыялістычнае спаборніцтва, арганізоўвала пераклічку з іншай,

Библиотека БГУИР

альбо выклікала гэтую школу на спаборніцтва за лепшую пастаноўку працы, напрыклад, па паляпшэнні паспяховасці, знішчэнні прагулаў і спазненнеў на заняткі.

З 1929 г. прафесійна-тэхнічныя школы, школы фабрычна-заводскага вучнёўства прынялі ўдзел ва Усесаюзным вытворчым паходзе. Гэты вытворчы паход пераўтварыўся ва ўсесаюзнае сацыялістычнае спаборніцтва. У час спаборніцтва ствараліся ўдарныя брыгады з ініцыятыўных, зацікаўленых, найбольш кваліфікаваных навучэнцаў, якія ставілі сваёй мэтай разам з інструктарам, майстрам ў найкарацейшы тэрмін дабіцца найлепшых вынікаў. Ствараліся групы рацыяналізатараў, якія шукалі шляхі паляпшэння працы, займаліся прапрацоўкай вытворчых нарад, арганізацыяй конкурсу на лепшага навучэнца і г.д. У правядзенні сацыялістычнага спаборніцтва школы фабрычна-заводскага вучнёўства і прафтэхшколы пад лозунгам "Тэхніку ў масы" арганізоўвалі тэхнічныя гурткі, станцыі, тэхнічныя кансультацыі, каб кожны рабочы, навучэнец-фабзавучнік ці рабочы-падлетак мог атрымаць даведку, якая яго цікавіць, авалодаць тэхнічнымі ведамі [18, с.7-14].

У 1930 г. прафтэхшколы былі ліквідаваны, а на іх базе створаны школы фабрычна-заводскага навучання. Яны выраслі колькасна, павялічыўся кантынгент вучняў. Школы фабрычна-заводскага навучання перайшлі з падпарадкавання Наркамасветы ў веданне гаспадарчых аб'яднанняў, Вышэйшага Савета народнай гаспадаркі і Наркамзема БССР.

Прафесійна-тэхнічныя школы, школа фабрычна-заводскага вучнёўства і спецыяльныя прафесійныя класы пры сямігадовай працоўнай школе з'яўляліся арганізацыйнай формай прафесійнай адукацыі і вырашалі задачу падрыхтоўкі кваліфікаваных рабочых для розных галін народнай гаспадаркі.

У сувязі з аднаўленнем і далейшым развіццём гаспадаркі ўсё больш адчувалася патрэба ў спецыялістах сярэдняй кваліфікацыі. Асноўным тыпам сярэдняй спецыяльнай школы быў тэхнікум.

З 1920 г. разгортваецца сетка індустрыяльных, сельскагаспадарчых, будаўнічых, медыцынскіх, педагагічных, мастацкіх тэхнікумаў. Перад тэхнікумамі ставіліся непасрэдныя задачы: падрыхтаваць і выхаваць спецыяліста з закончанай сярэдняй кваліфікацыяй (тэхніка), які мог бы кіраваць працай ў пэўнай галіне спецыяльнасці, уздымаць вытворчасць прадпрыемства і сваёй дзейнасцю накіроўваць савецкую гаспадарку і будаўніцтва па сацыялістычным шляху [17, арк.6]. Тэхнікумы не з'яўляліся ўстановамі масавага характару. Лік іх і спецыяльнасць вызначаліся ў строгай адпаведнасці з запатрабаваннямі гаспадаркі, культуры і савецкага будаўніцтва [17, арк.7]. Права паступлення ў тэхнікумы прадстаўлялася як скончыўшым сямігодку, так і выпускнікам прафтэхшкол на базе пачатковай школы. Скончыўшыя тэхнікум пасля 3 гадоў работы на вытворчасці прымаліся на 1-ы, а па той жа спецыяльнасці на 2-і курс вышэйшай навучальнай установы.

1922—1923 г. — гэта самыя цяжкія гады для асветы. Сярод тэхнікумаў на дзяржаўным утрыманні засталіся Мінскія 2-і беларускі, польскі і яўрэйскі педагагічныя, Бабруйскі і Барысаўскі педтэхнікумы, Мар'інагорскі сельскагаспадарчы, Слуцкі індустрыяльны, Мінскі і Бабруйскі рабочыя тэхнікумы [19, арк.15]. Паляпшэнне эканамічнага стану рэспублікі з

Библиотека БГУИР

1923-34 г. дало магчымасць значна павялічыць сродкі на народную асвету як па дзяржаўнаму, так і па мясцоваму бюджэту і гэтым значна палепшыць справу.

У 1923/24 навучальным годзе ў Беларусі працавалі 15 тэхнікумаў, з якіх 7 — у Мінску, 3 - у Бабруйску, 2 - у Барысаве, 2 - у Чэрвені, 1 - у Слуцку [20, арк.64], па спецыялізацыі 5 — педагагічных, 1 — сельскагаспадарчы, 5 — індустрыяльна-тэхнічных, 2 — медыцынскія і 2 — іншыя [21, с.368]. Большасць, як бачыгм, педагагічныя і індустрыяльна-тэхнічныя.

Згодна з палажэннем, педтэхнікумы (яны былі падпарадкаваны НКА) асноўнай задачай ставілі падрыхтоўку працаўнікоў усіх відаў сацыяльнага выхавання (настаўнікаў I канцэнтра сямігадовай школы, выхавацеляў дзіцячых дамоў і садкоў). Рыхтавалі спецыялістаў на роднай мове. Пры яўрэйскім і польскім педтэхнікумах існавалі падрыхтоўчыя групы. Курс навучання доўжыўся 4 гады, акадэмічная гадзіна — 50 хвілін, 45 гадзін ў тыдзень. На 1-м і 2-м курсах вывучаліся агульнаадукацыйныя дысцыпліны, на 3-м - агульнапедагагічныя, на 4-м дашкольная і школьная адукацыя з педагагічным ухілам [24, арк.34-37]. Індустрыяльна-тэхнічныя тэхнікумы знаходзіліся непасрэдна ў падпарадкаванні Губпрафадукацыі. Курс навучання ўстаноўлены 3-4 гады. У падрыхтоўчых групах вывучаліся агульнаадукацыйныя дысцыпліны, на першых двух курсах давалася агульная і спецыяльная адукацыя. На апошнім, 3-м ці 3-м і 4-м устанаўлівалася вызначаная спецыялізацыя шляхам адкрыцця аддзяленняў: а) эканамічнага; б) прамысловага. Гэтыя тэхнікумы рыхтавалі спецыялістаў сярэдняй кваліфікацыі для вытворчасці.

Статуты, навучальныя планы, штаты выпрацоўваліся саветамі тэхнікумаў у адпаведнасці з агульнымі распараджэннямі Наркамасветы. Навучэнцы павінны былі абавязкова прысутнічаць на ўсіх занятках, здаваць залікі, выконваць практычныя работы, наведваць экскурсіі і наогул выконваць унутраны распарадак навучальнай установы [25, арк.65]. Пастанова СНК БССР ад 28 мая 1924 г. абавязвала правядзенне практыкі вучняў апошніх курсаў тэхнікумаў.

У 1927 г., паводле звестак усесаюзнага школьнага перапісу, колькасць тэхнікумаў складала 30, у якіх навучалася 5 276 вучняў. 28 з іх працавалі ў гарадах і
2 — у сельскай мясцовасці [9, с. 156-157].

У перыяд нацыянальна-культурнага будаўніцтва былі патрэбны і спецыялісты творчых прафесій. У пачатку 1920-х гадоў у Мінску, Віцебску, Гомелі былі створаны музычныя тэхнікумы, якія сталі цэнтрамі музычнага жыцця і падрыхтавалі шмат музыкантаў.

Асобную старонку ў гісторыі станаўлення новай, сацыялістычнай культуры Савецкай Беларусі складае дзейнасць Віцебскага мастацкага тэхнікума, які з'яўляўся не толькі галоўным цэнтрам падрыхтоўкі мастацкіх кадраў, але і галоўным асяродкам кансалідацыі мастацкіх сіл рэспублікі. Віцебскі мастацкі тэхнікум быў адкрыты ў 1923 г. Кіраўніцтва тэхнікумам ажыццяўлялася Народным камісарыятам асветы. Па прапанове Віцебскага губернскага аддзела народнай адукацыі тэхнікум узначаліў мастак-педагог М. Керзін, які ўжо меў вопыт работы ў Веліжскай народнай мастацкай школе. Вызначаючы задачы тэхнікума, новае кіраўніцтва падкрэслівала: “У адрозненне ад былой школы, дзе вучыліся

Библиотека БГУИР

ў асноўным выхадцы з дробна-буржуазнага асяроддзя, студэнтамі тэхнікума павінны быць выхадцы ў асноўным з пралетарскага асяроддзя. Па-другое, новая школа павінна пастаянна здзяйсняць цесную сувязь з жыццём, прымяняючы на практыцы атрыманыя тэхнічныя навыкі шляхам выканання заказаў і г.д. Трэцяя асаблівасць заключаецца ў тым, што ў аснову творчасці новай школы павінны легчы рэвалюцыйна-класавыя ідэі і жыццё рабоча-сялянскай масы" [26, с.44].

Асноўны кантынгент выхавацеляў складалі мастакі-рэалісты. Узровень прафесійнай падрыхтоўкі ў тэхнікуме быў дастаткова высокі. Выкладаліся жывапіс, малюнак, скульптура, пластычная анатомія, гісторыя літаратуры, гісторыя мастацтва, фізіка, хімія і інш. У 1925-1927 гг. у тэхнікуме працавалі майстэрні ганчарна-керамічная, графічная, дэкаратыўная. У 1926/27 навучальным годзе ў тэхнікуме існавалі аддзяленні малярства, разьбярства, педагагічны аддзел, у 1927/28 навучальным годзе быў адкрыты графічны аддзел.

У 1926 г. кіраўніцтва тэхнікума звярнулася ў Народны камісарыят асветы БССР з прапановай адкрыць у Беларусі акадэмію мастацтваў. Але гэта ідэя не была падтрымана, бо яшчэ не было базы (на думку вышэйшых органаў кіраўніцтва), якая б адпавядала патрабаванням мастацкай вышэйшай школы.

У 1928 г. пры Дзяржаўным мастацкім вучылішчы (так з гэтага года стаў называцца тэхнікум) былі адкрыты курсы малявання для рабочых, чырвонаармейцаў, куды было прынята больш за 50 чалавек.

Значэнне Віцебскага мастацкага тэхнікума, як першай кузні мастацкіх кадраў Савецкай Беларусі, безумоўна. Пра гэта сведчаць імёны такіх мастакоў, як В. Цвірка, К. Касмачоў, З. Азгур і іншых, вядомыя цяпер далёка за межамі нашай рэспублікі.

Высокія тэмпы развіцця прамысловасці і сельскай гаспадаркі можна было захаваць толькі пры ўмове ўзрастаючага іх папаўнення спецыялістамі. Перад сістэмай народнай адукацыі БССР ставілася задача ліквідаваць недахоп у кваліфікаваных кадрах. На IX Усебеларускім з'ездзе Саветаў у маі 1929 г. у дакладзе А.В. Баліцкага (Наркама асветы БССР да жніўня 1929 г.) "Аб 5-ці гадовым плане развіцця культуры БССР" прааналізавана адставанне БССР у падрыхтоўцы інжынераў і тэхнікаў. У Савецкім Саюзе на 100 рабочых прыпадала інжынераў і тэхнікаў 1,8 чалавек, а ў БССР - толькі 0,8 чалавек (адставанне больш чым у два разы), навучэнцаў тэхнікумаў у СССР — 1,3, у БССР - 1,1 чалавек [28, с.327]. Была пастаўлена задача захаваць існуючыя тэхнікумы і павялічыць у іх набор навучэнцаў. Ва ўсіх навучальных установах да лютага 1930 г. уводзілася адзінаначалле, ліквідаваліся педагагічныя Саветы ў тэхнікумах. У мэтах увязкі работы навучальных устаноў з шырокай савецкай грамадскасцю і ў сувязі з узмацненнем шырокага грамадскага кантролю арганізоўваліся саветы, у склад якіх уваходзілі прадстаўнікі партыйных, прафсаюзных, гаспадарчых арганізацый, прадстаўнікі супрацоўнікаў і студэнтаў, рабочых ад прадпрыемстваў і калгаснікаў [29, арк.9-10].

Пастановай ад 21 чэрвеня 1930 г. была вызначана рэарганізацыя сярэдніх спецыяльных устаноў. Усе сельскагаспадарчыя, вячэрнія тэхнікумы і тэхнікумы саматужнай прамысловасці перадаваліся ў веданне УСНГ, у веданне Наркамгандлю — лясны тэхнікум у Оршы і рыбны ў Жыткавічах, у веданне Наркамаховы здароў'я —

Библиотека БГУИР

Магілёўскі медыцынскі тэхнікум, у веданне Белкаапсаюза — Віцебскі кааператыўны тэхнікум з утрыманнем яго за кошт кааперацы [21, с.68-69]. У канцы 1930 г. у БССР было 58 тэхнікумаў з лікам 11 249 навучэнцаў [30, с.32]. СНК БССР прызнаў неабходным адкрыць на працягу 1930/31 навучальнага года і ў наступныя гады індустрыяльныя тэхнікумы і аддзяленні ў іх па падрыхтоўцы тэхнікаў для прамысловасці БССР, такіх тэхнікумаў як запалкавы (Барысаў), тэкстыльны і льнопрадзільны (Орша), будаўнічы і вячэрняе аддзяленне

пры ім (Магілёў), па апрацоўцы дрэва (Бабруйск), аддзяленне радыётэхнікі пры політэхнічным (Віцебск), аўтатрактарны і вячэрнее аддзяленне пры ім (Гомель), саматужны тэхнікум і вячэрняе аддзяленне пры ім (Магілёў) [31, арк.165].

Надаючы вялікую ўвагу падрыхтоўцы спецыялістаў ніжэйшай і сярэдняй кваліфікацыі, органы народнай асветы і ўрад адначасова вялі работу па стварэнні беларускай вышэйшай школы. Вышэйшыя навучальныя установы, якіх да Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Беларусі не было, былі прызваны рыхтаваць арганізатараў і кіраўнікоў вытворчасці вышэйшай кваліфікацыі з ліку тых, хто скончыгў тэхнікум ці рабфак.

Да 1922 г. існаваў Віцебскі археалагічны існтытут, створаны на базе аддзялення Маскоўскага археалагічнага інстытута. Некаторы час у Віцебску працавалі таксама мастацка-практычны інстытут (у 1923 г. рэарганізаваны ў мастацкі тэхнікум), механіка-будаўнічы і сельскагаспадарчы інстытуты. Аднак, матэрыяльныя цяжкасці прывялі да закрыцця гэтых інстытутаў у пачатку 1920-х гадоў. Па гэтых жа прычынах закрыты ў канцы 1921 г. Мінскі інстытут народнай адукацыі, у 1923—1924 гг. — Віцебскі і Магілёўскі практычныя інстытуты народнай адукацыі. Іх студэнты былі пераведзены на педагагічны факультэт БДУ.

У красавіку 1919 г. камісія Наркамасветы РСФСР прыняла рашэнне аб аднаўленні Горы-Горацкага земляробчага інстытута на базе двух раней існаваўшых сельскагаспадарчых вучылішч. У 1922 г. на 4 факультэтах інстытута — сельскагаспадарчым, лясным, інжынерна-меліярацыйным і культурна-тэхнічньгм - навучалася каля 700 студэнтаў.

У Мінску ў снежні 1920 г. на базе політэхнічнага вучылішча быў створаны Беларускі політэхнічны інстытут у складзе механічнага, культурна-тэхнічнага, агранамічнага і лясного факультэтаў. Да заняткаў прыступілі каля 500 студэнтаў. У сувязі са слабым развіццём прамысловасці, яе разбурэннем у гады вайны, нязначным попытам на інжынерна-тэхнічныя кадры політэхнічны інстытут у канцы 1921 г. быў закрыты і на яго базе ў 1922 г. створаны інстытут сельскай і лясной гаспадаркі.

У 1925 г. адбылося зліццё Мінскага інстытута сельскай і лясной гаспадаркі і Горы-Горацкага земляробчага інстытута і на іх базе створана Беларуская акадэмія сельскай гаспадаркі імя Кастрычніцкай рэвалюцыі ў складзе агранамічнага, лясного, землеўпарадкавальнага і меліярацыйнага факультэтаў. За 1925—1930 гг. акадэмія падрыхтавала 1 247 спецыялістаў для сельскай гаспадаркі [32, с.156].

У адпаведнасці з патрабаваннямі шырокага развіцця ў краіне універсітэцкай адукацыі ў Мінску быў адкрыты Беларускі дзяржаўны універсітэт (БДУ). Заняткі ў БДУ пачаліся ў

Библиотека БГУИР

1921 г. У складзе універсітэта спачатку былі тры факультэты: медыцынскі, грамадскіх навук, рабочы. У 1922 г. быў створаны педагагічны факультэт з аддзяленнямі фізіка-матэматычным, прыродазнаўчым, сацыяльна-гістарычным, мовы і літаратуры. Праз некаторы час пачаў работу факультэт права і гаспадаркі, а затым хіміка-тэхналагічны. У першы год ва універсітэце вучылася 1 250 студэнтаў, у 1922 г. у БДУ было прынята 1 480 чалавек, з якіх -229 на педфак [2, арк.47].

Цяжкае матэрыяльнае становішча ў дзяржаве прымусіла ўрад БССР у лістападзе 1922 г. увесці плату за навучанне ва ўсіх вышэйшых навучальных установах, акрамя спецыяльнасцей педагагічнага і сацыяльна-эканамічнага профілю, у памеры 50 рублёў. Грошы, выдадзеныя пасля 1 кастрычніка 1922 г. стыпендыяй (згодна з пастановай СНК ад 22 мая 1923 г.), павінны былі быць вернуты шляхам адпрацоўкі з разліку 1 год за 1 год (каляндарнага атрымання стыпендыі) пасля заканчэння курса ці навучальнай установы [2, арк.65].

Вышэйшая школа ў Беларусі будавалася з дапамогай рускага, украінскага і іншых народаў СССР. Расійская Федэрацыя і Украіна накіравалі ў БССР абсталяванне для лабараторый, вучэбныя дапаможнікі. БДУ былі выдзелены значныя грашовыя сродкі. Многія вышэйшыя навучальныя ўстановы краіны, цэнтральная кніжная палата перадалі яму навуковую літаратуру. З Маскоўскага, Ленінградскага, Кіеўскага універсітэтаў на работу ў Мінск прыехалі вядомыя дзеячы медыцыны Б.М. Беркенгейм, А.П. Бястужаў, М.Б. Кроль, С.М. Мягкіх. Яны заснавалі шэраг кафедр медыцынскага факультэта БДУ, заклалі аснову развіцця медыцынскай навукі ў БССР. У вышэйшых навучальных установах рэспублікі працавалі такія відныя вучоныя, як У.І. Пічэта (першы рэктар БДУ, гісторык-славіст, прафесар), М.М. Нікольскі, В.М. Дзьякаў, У.М. Перцаў, М.А. Прыляжаеў, Ц.М. Годнеў, М.П. Сакалоўскі, Е.Е. Сіроцін, А.К. Ленц, Б.Я. Эльбер і інш.

На 1 кастрычніка 1923 г. у БДУ налічвалася 10 лабараторый, 9 кабінетаў, працавала бібліятэка. У яго сценах вучыліся больш за 2 300 студэнтаў, навуковую і вучэбную працу вялі 31 прафесар, 51 выкладчык, 59 асістэнтаў і іншыя супрацоўнікі. У 1926 г. адбыўся першы выпуск спецыялістаў. Дыпломы атрымалі 130 юрыстаў, 170 урачоў, 175 эканамістаў, 244 педагогі [33, с.81].

Улічваючы вострую патрэбу ў спецыялістах высокай кваліфікацыі для сельскай гаспадаркі, у лістападзе 1924 г. ЦВК БССР прыняў рашэнне адкрыць у Віцебску ветэрынарны інстытут. У наступным годзе існаваўшая ў Мінску Вышэйшая партыйная школа была рэарганізавана ў Камуністычны універсітэт імя У.І. Леніна. Папярэднікам Акадэміі навук Беларусі з'явіўся створаны ў 1922 г. Інстытут беларускай культуры.

За 10 гадоў Савецкай улады вышэйшыя навучальныя ўстановы БССР выпусцілі 690 спецыялістаў, сярод іх 298 настаўнікаў, 222 спецыялісты сельскай гаспадаркі, 170 урачоў і работнікаў фізічнай культуры [30, с.37].

У аснову камплектавання вышэйшых навучальных устаноў і тэхнікумаў быў пакладзены класавы прынцып, калі перавага надавалася рабочым і сялянам. Гэта палітыка атрымала назву "пралетарызацыі". У 1926/27 навучальным годзе рабочых і іх дзяцей у вышэйшых навучальных установах было 14,6%, сялян -49,9%; у 1927/28 навучальным

Библиотека БГУИР

годзе рабочыя і іх дзеці ў вышэйшых навучальных установах складалі 15,8%, сяляне - 44,5% [34, с.14-15].

Праблема інжынерна-тэхнічных кадраў ва ўмовах БССР станавілася найбольш балючай. У рэспубліцы хуткімі тэмпамі ішло развіццё буйной прамысловасці, а забяспечанасць яе кадрамі кваліфікаваных спецыялістаў была недастатковая. У 1929 г. у прамысловасці УСНГ працавалі 101 інжынер, 164 тэхнікі і 420 практыкаў, што складала ўсяго толькі 2,14% ад агульнай колькасці рабочых [35, с.40]. Такое становішча з'яўлялася вынікам таго, што да 1930 г. Беларусь не мела сваіх тэхнічных вышэйшых навучальных устаноў.

У 1929 г. пры БДУ ўтвараецца хіміка-тэхналагічны факультэт. У 1930 г. было адкрыта пяць галіновых тэхнічных і планава-эканамічных інстытутаў.

У 1930—1931 гг. у Беларусі створаны новая сістэма і сетка навучальных устаноў па падрыхтоўцы інжынерна-тэхнічных, сельскагаспадарчых кадраў і эканамістаў. Пачалася рэарганізацыя БДУ у мэтах стварэння новых вышэйшых навучальных устаноў. У 1930 г. у складзе Беларускага дзяржаўнага універсітэта засталіся толькі тры факультэты: фізіка-матэматычны, хімічны і біялагічны (300 студэнтаў), а на базе іншых факультэтаў было створана шэсць самастойных інстытутаў: Мінскі медыцынскі інстытут (на базе медыцынскага факультэта), Вышэйшы педагагічны інстытут (на базе педагагічнага факультэта, цяпер Дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка), Магілёўскі палітыка-асветніцкі інстытут (на базе палітыка-асветніцкага аддзялення педагагічнага факультэта), планава-эканамічны і кааператыўны (на базе факультэта народнай гаспадаркі), савецкага будаўніцтва і права (на базе аднайменнага факультэта) [32, с.168]. Універсітэт перажываў адзін з самых цяжкіх перыядаў свайго існавання. Такое ж становішча назіралася і ў Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі. У 1930/31 навучальным годзе на базе факультэтаў Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі былі створаны 11 навучальных устаноў. Сярод іх інстытуты — лясны (Гомель), заатэхнічны, воднамеліярацыйны, кармавых культур, прадзільных культур (Горкі), свінаводчы (Сляпянка пад Мінскам), садова-агародны (Лошыца) і інш. [21, с. 117-118].

Аслаблялася матэрыяльная база "карлікавых" вышэйшых навучальных устаноў і вышэйшых тэхнічных навучальных устаноў, нерацыянальна выкарыстоўваліся сродкі, пагаршаўся якасны ўзровень прафесарска-выкладчыцкага складу, з-за частай змены вучэбных планаў і праграм парушалася дысцыпліна, зніжаліся якасць падрыхтоўкі спецыялістаў і прэстыж вышэйшай школы. Многія навучальныя ўстановы ўжо праз год не маглі працягваць работу. Трэба было тэрмінова выпраўляць памылкі, рабіць новую рэарганізацыю навучальных устаноў, іх узбуйненне.

Такім чынам, прафтэхшколы, школы фабрычна-заводскага вучнёўства і прафтэхкурсы з'яўляліся ўстановамі ніжэйшай прафесійна-тэхнічнай адукацыі і вырашалі задачу падрыхтоўкі кваліфікаваных рабочых для розных галін народнай гаспадаркі. У гады сацыялістычнай індустрыялізацыі сетка прафесійна-тэхнічных устаноў рэспублікі значна павялічылася. Выкладчыкі і навучэнцы ўдзельнічалі ва Усесаюзным сацыялістычным спаборніцтве. Ствараліся ўдарныя брыгады, групы рацыяналізатараў, арганізоўваліся

Библиотека БГУИР

конкурсы на лепшага навучэнца. Пад лозунгам "Тэхніку ў масы" ствараліся тэхнічныя гурткі і тэхнічныя станцыі, праводзіліся тэхнічныя кансультацыі.

Асноўным тыпам сярэдняй спецыяльнай школы быў тэхнікум. Тэхнікумы не з'яўляліся ўстановамі масавага характару. Перад імі ставілася задача падрыхтаваць і выхаваць спецыяліста сярэдняй кваліфікацыі (тэхніка), які мог бы кіраваць працай у пэўнай галіне спецыяльнасці, дапамагаць уздыму вытворчасці прадпрыемства і сваёй дзейнасцю накіроўваць савецкую гаспадарку па сацыялістычнаму шляху.

Вышэйшыя навучальныя ўстановы, якіх да Кастрычніцкай рэвалюцыі не было ў Беларусі, прызваны былі рыхтаваць арганізатараў і кіраўнікоў вытворчасці вышэйшай кваліфікацыі. У сувязі з адсутнасцю ў 1920-я гады ў сістэме адукацыі Беларусі сярэдняй агульнаадукацыйнай школы (асноўным яе тыпам з'яўлялася сямігадовая школа) камплектаванне вышэйшых навучальных устаноў прадугледжвалася рабіць за кошт выпускнікоў тэхнікумаў. Аднак іх параўнальна невялікая колькасць не магла забяспечыць падрыхтаваным кантынгентам вышэйшыя навучальныя ўстановы. У значнай ступені гэту праблему дапамагалі вырашаць рабочыя факультэты, якія з'яўляліся важным каналам папаўнення вышэйшых навучальных устаноў рабоча-сялянскай моладдзю. Наркамасветы БССР практыкаваў таксама для падрыхтоўкі ў вышэйшыя навучальныя ўстановы адкрыццё двухгадовых агульнаадукацыйных курсаў, кароткатэрміновых курсаў з працягласцю навучання 4-5 месяцаў, прафесійных класаў пры некаторых сямігадовых працоўных школах. Дарога у вышэйшыя навучальныя ўстановы, як бачна, прахолзіла праз рабфакі, тэхнікумы, школы II ступені і дзевяцігадовыя школы, агульнаадукацыйныя курсы і прафесійныя класы пры сямігадовых школах.

Библиотека БГУИР

Спіс выкарыстаных крыніц:


1. Условия приёма на рабочие факультеты, утверждённые Коллегией Научного сектора Наркомпроса // Школа и культура Советской Белоруссии.—1921.—№ 1-2.—С.11-12.
2. НА РБ, ф.42, воп.1, спр.213.
3. НА РБ, ф.4, воп.3, спр.4.
4. Белорусская ССР в цифрах: К 10-летию существования БССР. 1919-1929 / Центр. стат. упр.-Минск, 1929.-534 с.
5. Вынікі прыёму ў ВНУ, рабфакі і тэхнікумы // Асвета.-1929.—№1.—С.141—142.
6. Материальное обеспечение студентов / Вестник Народного Комиссариата Просвещения С.С.Р.Б.-1922.—№7-8.—С.10-11.
7. НА РБ, ф.6, воп.1, спр.1843.
8. Очерки истории школы и педагогической мысли народов СССР. (1917— 1941 гг.) / Отв. ред.: Н.П. Кузин, М.Н. Колмакова, З.И. Равкин.—М.: Педагогика, 1980.-456с.
9. Беларуская ССР.Дзяржплан. Эканоміка-статыстычны сектар:Усесаюзны школьны перапіс 1927 года.- Мінск, 1930.- 241с.
10. НА РБ, ф.4, воп.8, спр.17, ч.1.
11. Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК: В 2 -х т.—Т.1.--Минск: Беларусь, 1983-1984.(1918-1927 гг.)—1983.-527с.; Т.2 (1928-1932 гг.).-1984.-511с.
12. Народная адукацыя і педагагічная навука ў Беларусі (1917-1945) / Пад рэд.: Г.Р. Сянькевіч, А.П. Лыча, А.Г. Андрэевай.—Мінск: Нар. асвета, 1993.-495с.
13. НА РБ, ф.44, воп.1, спр.164.
14. Твар прафшкольца Міншчыны // Асвета.-1926.—№ 6.—С.194-202.
15. НА РБ, ф.42, воп.1, сыр.1214, ч.2.
16. Статыстычны даведнік на 1928 год.—Мінск, выд. Цэнтр. стат. упр. БССР.— 1928. -204с.
17. НА РБ, ф.42, воп.1, спр.1264.
18. Рамізевіч В. Школы ФЗВ і прафтэхшколы на сацыялістычныя выперадкі. // Асвета.--1929.--№5-6.—с.7-14.
19. НА РБ, ф.42, воп.1, спр.1183.
20. НА РБ, ф. 42, воп.1, спр.675.
21. Народное образование в БССР: Сб. док. и материалов: В 2 -х т.—Минск: Наука и техника, 1979-1980. Т.1: 1917-1927 гг.-1979.-459 с; Т.2: 1927-1941 гг.-1980.—463с.
22. НА РБ, ф.101, воп.1, спр.3303.
23. Нарысы гісторыі народнай асветы і педагагічнай думкі ў Беларусі / С.А.Падокшын, В.І.Мялешка, Г.Р. Сянькевіч, А.І.Мальдзіс і інш. Гал.рэд. С.А.Умрэйка.-Мінск: Нар. асвета, 1968.-612.
24. НА РБ, ф.42, воп.1, спр.211, ч.1.
25. НА РБ, ф.265, воп.1, спр.637.
26. Гісторыя беларускага мастацтва ў 6 тамах. Т. 4 1917-1941. Мінск, Навука і тэхніка, 1990.
27. Стэнаграфічная справаздача XII з,езду КП(б): 5-14 лют. 1929 г.- Мінск: Выд-ва ЦК КП(б)Б, 1929.-577с.
28. Дзевяты. Усебеларускі з езд рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў. Стэнагр. справаздача.—Мінск, выд ЦВК БССР, 1929.-576с.
29. НА РБ, ф.6, воп.1, спр.1843.


Библиотека БГУИР

30. Культурное строительство БССР. Издание УМХУ БССР. Минск. 1940.-109 с.
31. НА РБ, ф.101, воп.1, спр.3136.
32. Гісторыя Беларусі: Вучэб. дапам. для ВНУ: У 2 -х ч. / Пад. рэд.: Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля.—Ч.2.--Мінск: Універсітэцкае, 1998.— люты 1917-1997 гг.-463с.
33. Силиванчик П.П. Деятельность Коммунистической партии Белоруссии по осуществлению культурной революции в республике (1919-1937).-Минск: Изд-во БГУ, 1961.- 235 с.
34. Валасевіч В. Вынікі прыёму ў прафесійныя навучальныя ўстановы ў 1927-28 гг. // Асвета.-1927.—№ 8.—С.6-16.
35. Лысоў С. Праблема кадраў і яе вырашэнне // Асвета.-1929, № 11-12, с.38—46.

Библиотека БГУИР